Шыфр: 1 варыянт

Колькасць балаў: ________________

Месца: ____________________

**Зацвярджаю**

**Намеснік старшыні**
**арганізацыйнага камітэта**
**намеснік Міністра адукацыі**
______________ **К.С. Фарыно**

«20» 12 2011 года

# III ЭТАП XXVIII РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ШКОЛЬНІКАЎ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

**Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры**

**11 клас**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | | | | | | | | | | | |

**Варыянт 1**

**Заданне 1.** Вызначце і запішыце па-беларуску лексічнае значэнне рускага і беларускага слова ў пары. Запішыце, як называецца гэтая з'ява.

*Узор: краска – краска: палявая кветка – рэчыва, якое надае пэўны колер прадметам.*

*Максімальная колькасць балаў – 4 (3 + 1).*

| | |
|---|---|
| 1) падарожнік – подорожник: | |
| 2) твар – тварь: | |
| 3) вядомы – ведóмый: | |
| *Гэтая з'ява называецца…* | |

**Заданне 2.** Аб'яднайце пары слоў у групы паводле сэнсавых адносін слоў у парах. Назавіце гэтыя групы.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

Вязнуць – грузнуць, дзейсны – эфектыўны, зблізіць – аддаліць, натуральны – штучны, рэгрэс – рэгрэсія.

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

**Заданне 3.** Упішыце словазлучэнні ў патрэбныя слупкі табліцы.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

(А, а)фрыканскі (К, к)антынент, (Дз, дз)ень (Б, б)ібліятэк, (Дз, дз)ень (К, к)анстытуцыі, (З, з)імовая (А, а)лімпіяда, (З, )знакі (З, з)адыяка, (К, к)аралеўства (Н, н)арвегія, не давядзі (Г, г)оспадзі, (П, п)аўночная (Ш, ш)ырата, служыцелі (Ф, ф)еміды, (С, с)онечная (С, с)істэма.

| Усе словы з малой літары | 1-е слова з вялікай літары | 2-е слова з вялікай літары | Усе словы з вялікай літары |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |

**Заданне 4.** Патлумачце значэнне фразеалагізма (*1*). Запішыце фразы, у якіх названы фразеалагізм выконвае ролю розных членаў сказа (*2*).

*Максімальная колькасць балаў – 6 (1 + 5).*

***галаву прыхінуць***________________________________________________

| Член сказа | Ілюстрацыя |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

**Заданне 5.** Запоўніце табліцу, вызначыўшы прыналежнасць выдзеленага слова да пэўнай часціны мовы.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| Сказ | Часціна мовы |
|---|---|
| 1) *Людзі дапамогуць, **толькі** сам рук не апускай.* | |
| 2) *На двары яшчэ **толькі** развіднелася.* | |
| 3) *Чаго там **толькі** не было!* | |
| 4) ***Толькі** я лягу і вочы закрыю, бачу я вас прад сабою.* | |
| 5) *У вагоне было ўсяго **толькі** некалькі чалавек.* | |

**Заданне 6.** Традыцыйна прапануецца вызначыць паранімічныя пары слоў праз іх лексічнае значэнне.

Правядзіце адваротную "аперацыю": да прыведзеных значэнняў запішыце словы, якія перадаюць гэтае лексічнае значэнне.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

1) *'агароджанае месца ў свірне, клеці для захавання збожжа, мукі'* (____________) – *'штучнае ўмацаванне для ссечаных дрэў, звернутых верхавінамі ў бок непрыяцеля'* (______________);

2) *'большы ў тры разы'* (_______________) – *'які складаецца з трох частак, трайны'* (_____________);

3) *'набірацца розуму, станавіцца разумнейшым'* (________________) – *'паступаць па-свойму, пускацца ў абстрактныя непатрэбныя разважанні'* (________________).

4) *'месца, дзе вырошчваюць маладыя расліны для высадкі ў грунт'* (________________) – *'крыніца з'яўлення, размнажэння, распаўсюджання чаго-небудзь'* (___________________);

5) *'які з'яўляецца ўзорам, мадэллю для чаго-небудзь; стандартны'* (______________) – *'які часта сустракаецца, звычайны'* (_______________).

**Заданне 7.** Устанавіце адпаведнасць паміж сімваламі і словамі (1) *заходні*, (2) *дзьмуць*, (3) *плакаць*, (4) *дыхаць*, (5) *вясёлы*, паставіўшы адпаведную лічбу

Адкажыце, ці можа сімвалічнае пісьмо стаць агульназразумелай універсальнай мовай. Адказ аргументуйце.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*



АРГУМЕНТАЦЫЯ:

**Заданне 8.** Запоўніце табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – 9 (1 бал за правільны адказ).*

| **Род літаратуры** | **Аўтар – творчае імя** | **Аўтар – сапраўднае імя** | **Твор** | **Жанр** | **Ідэя і яе ўвасабленне** | **Характэрная цытата – ілюстрацыя з твора** |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лірыка | | | "Явар і каліна" | Пейзажная / філасофская лірыка | Ідэя вечнасці жыцця, кахання, гармонія чалавека і прыроды. Адухаўленне вобразаў дрэваў | |
| Эпас / ліра-эпас | | Канстанцін Міцкевіч | | | Аўтабіяграфічны твор. Шырокае адлюстраванне народнага побыту і прыроды. Філасофская ідэя зямлі і волі. | Мой родны кут, як ты мне мілы! |
| | Янка Купала | | | Сацыяльна-філасофская драма | Пошукі маладым пакаленнем рэальных шляхоў вызвалення Бацькаўшчыны. | *Сымон*: На вялікі сход! Па Бацькаўшчыну!!! |

**Заданне 9.** Адзначце «лішняе» ў прыведзеным пераліку. Выбар растлумачце.

*Максімальная колькасць балаў – 2.*

Барока, сентыменталізм, аповесць, кульмінацыя, рэалізм, паэма, раман, рамантызм, класіцызм.

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ:______________________

АБГРУНТАВАННЕ:______________________
______________________
______________________

**Заданне 10.** Устаўце прапушчаныя словы. Запішыце назву твора, псеўданім і сапраўднае імя аўтара, час напісання твора.

*Максімальная колькасць балаў – 9 (1 бал за кожны правільны адказ).*

Вобразы мілыя роднага краю,
__________ і радасць мая!
Што маё сэрца да вас парывае?
Чым так прыкованы я.

К вам, мае ўзгорачкі роднага поля,
Рэчкі, курганы, лясы,
Поўныя __________ і жальбы нядолі,
Поўныя __________ красы?

Толькі я лягу і вочы закрыю,
Бачу я вас прад сабой.
Ціха праходзіце вы, як жывыя,
__________ мілай красой.

Чуецца гоман мне спелае нівы,
Ціхая жальба палёў,
Лесу высокага шум-гул шчаслівы,
Песня __________ дубоў...

Вобразы мілыя, вобразы смутныя,
Родныя вёскі і люд,
Песні цягучыя, песні пакутныя!..
Бачу і чую вас тут.

НАЗВА ТВОРА:______________________

ПСЕЎДАНІМ:______________________

САПРАЎДНАЕ ІМЯ АЎТАРА:______________________

ЧАС НАПІСАННЯ ТВОРА:______________________